*УДК 81.37(476.5)*

**Семянькова Г. К.**

*(Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава, г. Віцебск, Беларусь)*

# СУЧАСНАЯ МІКРАТАПАНІМІЯ ВІЦЕБШЧЫНЫ: СЕМАНТЫЧНЫ АСПЕКТ*

*В статье рассмотрено десять семантических групп микротопонимов, бытующих на территории Витебской области. Проанализированы наименования, связанные с именами и фамилиями, соотносимые с названиями диких зверей, домашних животных, рептилий, обусловленные внешними особенностями и качествами объекта, микротопонимы, возникновение которых продиктовано растительностью края, онимы, связанные с событиями, происходившими на определенной территории, с национальностью людей, названиями должностей и родственных отношений, единицы, характеризующие расположение объекта в пространстве, наименования, образованные от названий бывших или существующих деревень, и др.*

***Ключевые слова:*** *семантика, микротопоним, микротопонимия, микротопонимика, топоним, топонимика, оним.*

Мікратапонімы цесна звязаны з жыццём і дзейнасцю чалавека: яны захоўваюць звесткі пра заняткі нашых продкаў у мінулым, асаблівасці паселішчаў, жывёльны і раслінны свет краю. Вывучэнне такіх неафіцыйных найменняў дае каштоўны матэрыял для этнаграфіі, гісторыі, геаграфіі, дыялекталогіі, археалогіі, бо мікратапонімы часам утрымліваюць інфармацыю, якая страчана сучаснымі носьбітамі мовы, але зберагласся менавіта ў неафіцыйных тапанімічных адзінках. Вось чаму праца па зборы і навуковым апісанні рэгіянальнай мікратапаніміі Віцебшчыны, як і іншых рэгіёнаў Беларусі, на сённяшні час з’яўляецца актуальнай.

На працягу апошніх чатырох гадоў супрацоўнікі кафедры і студэнты факультэта гуманітарных ведаў і камунікацый Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта ажыццяўляюць працу па вывучэнні мікратапонімаў, народна-дыялектных фразеалагізмаў, прыказак, прымавак, што функцыянуюць у вусным маўленні жыхароў Віцебскай вобласці. У межах названай тэмы вядзецца актыўная работа па збіранні і слоўнікавым апісанні рэгіянальных найменняў, ажыццяўляецца апрацоўка створанай базы, неабходнай для ўкладання лексікаграфічных даведнікаў па мікратапаніміі і парэміялогіі.

Даследаванне праведзена на базе матэрыялу, сабранага на працягу 2020–2024 гг. у 74 населеных пунктах 18 раёнаў Віцебскай вобласці (Аршанскі, Бра-

* Артыкул выкананы ў рамках навуковай тэмы кафедры беларускай і рускай філалогіі ўстановы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава» «Функцыянаванне сучаснай беларускай мовы ў вуснай камунікацыі і пісьмовым тэксце: сацыяльна-дзяржаўны, нацыянальна-культурны і краязнаўча-рэгіянальны параметры» на 2021–2025 гады (№ дзярж-рэгістрацыі 20210458 ад 31.03.2021).

слаўскі, Верхнядзвінскі, Віцебскі, Гарадоцкі, Глыбоцкі, Докшыцкі, Дубровенскі, Лепельскі, Лёзненскі, Мёрскі, Полацкі, Пастаўскі, Расонскі, Сенненскі, Талачынскі, Чашніцкі, Шаркаўшчынскі). Усяго было зафіксавана і прааналізавана больш за 500 мікратапанімных адзінак.

Аналіз матывацыі мікратапонімаў прадугледжвае выяўленне прычын, па якіх пэўны аб'ект атрымаў тую ці іншую назву. У аснову гэтай працы пакладзена класіфікацыя, прапанаваная Я. М. Адамовічам [1], што была пашырана за кошт груп, не названых даследчыкам, але выяўленых падчас аналізу фактычнага матэрыялу.

Першая група найменняў (самая шматлікая па колькасці) звязана з антрапонімамі – імёнамі і прозвішчамі людзей, што мелі пэўнае дачыненне да мясцовасці, на якой зафіксавана неафіцыйнае найменне: *Цімкіна пожня* – назва часткі лесу, дзе раней размяшчаўся хутар, гаспадара якога звалі Цімка (в. Канстатова, Сенненскі р-н); *Федзькаў ручай* – ручай, побач з якім стаяла хата, а гаспадара звалі Федзька (в. Букава, Мёрскі р-н).

Падлічана, што група адзінак, утвораных ад імён людзей, пераважае над групай найменняў, што суадносяцца з прозвішчамі (прапорцыя складае прыкладна 3:2 адпаведна). Сярод назваў, утвораных ад мужчынскіх імён, значна прэвалююць адзінкі, звязаныя з афіцыйнымі формамі. Іншая сітуацыя назіраецца сярод найменняў, суадносных з жаночымі імёнамі: размоўныя формы пераважаюць над поўнымі афіцыйнымі прыкладна ў два разы.

Другая група – мікратапонімы, утвораныя ад назваў дзікіх звяроў, свойскіх жывёл, рэптылій: *Дзіч* – балота, дзе можна сустрэць шмат дзікоў (аг. Параф'янава, Докшыцкі р-н); *Мядзведзіха* – частка вёскі, што знаходзілася недалёка ад лесу, у якім вадзіліся мядзведзі (в. Нябышына, Докшыцкі р-н); *Ліссія Норы* – вялікі пагорак, дзе знаходзіцца шмат лісіных нор (в. Парэчча, Талачынскі р-н); *Казлы* – частка вёскі, аддзеленая дарогай ад усёй вёскі; па словах мясцовых жыхароў, раней на тым месцы размяшчалася ферма, у якой гадавалі коз (в. Вярэнькі, Пастаўскі р-н); *Змяінае балота* – участак лесу сярод палёў; раней на гэтым месцы было мохавае балота без вады, дзе вадзілася шмат змей (в. Сар'я, Верхнядзвінскі р-н); *Змяёўка* – поле, на якім было многа змей (в. Савуткі, Шаркаўшчынскі р-н).

Трэцяя група – мікратапонімы, звязаныя са знешнімі асаблівасцямі і якасцямі аб'екта. Група найменняў, якія характарызуюць той ці іншы аб'ект па колеры, у нашым матэрыяле з'яўляецца адной з самых распаўсюджаных: *Белы мост* – мост, пабудаваны ў час меліярацыі, такую назву атрымаў праз свой колер (аг. Камень, Лепельскі р-н); *Красны мох* – балота, назва якога звязана з колерам вады ў ім (аг. Камень, Лепельскі р-н). Адзначым, што дастаткова вялікую частку гэтых назваў складаюць найменні, суадносныя з *белым* і *чорным* колерамі.

У групу найменняў, што характарызуюць аб'екты па іх форме, мы ўключылі наступныя назвы: *Гарбаты мост* – мост, названы так з-за сваёй формы (в. Слабодка, Браслаўскі р-н); *Піраміда* – гандлёвы цэнтр Мірка-Сіці, які атрымаў сваю назву з-за формы, што нагадвае піраміду (г. Віцебск).

У межах гэтай групы 4 адзінкі маюць аднолькавую назву і адзначаюцца ў розных рэгіёнах Віцебскай вобласці. Так, найменне *Штаны* маюць плошча, дарога, частка лесу. Аб'ектам уласціва агульная рыса: яны раздвойваюцца і па форме нагадваюць прадмет адзення:

*Штаны* – назва плошчы 17 Верасня; па форме нагадвае штаны, бо размяшчаецца на перакрыжаванні трох вуліц (г. Глыбокае);

*Штаны* – месца ў лесе, дзе дарога разыходзіцца ў два бакі (в. Пагодзіна, Дубровенскі р-н);

*Штаны* – назва лесу каля вёскі, які на дзве часткі падзяляе балота; здалёк гэтае месца па форме нагадвае штаны (в. Мар'іна, Чашніцкі р-н);

*Штаны* – месца перасячэння вуліц Кляро і Гагарына; вуліцы ідуць амаль паралельна, а потым сыходзяцца ў адным месцы, утвараючы тупік (г. Паставы).

Даволі распаўсюджанымі з'яўляюцца найменні, што характарызуюць аб'ект па знешняй адметнасці: *Голы мох* – балота носіць такую назву з-за таго, што там не растуць ні дрэвы, ні кусты (в. Ізгародзішча, Чашніцкі р-н); *Крутавец* – ручай, які меў вялікую працягласць з рэзкай зменай кірунку плыні (в. Гараны, Аршанскі р-н).

Сярод адзінак гэтай групы вылучаецца мікратапонім *Лысая гара*, які сустракаецца 4 разы ў розных раёнах Віцебшчыны (Пастаўскі, Шаркаўшчынскі, Віцебскі, Аршанскі). Як правіла, такім найменнем абазначаюць узвышша, на якім адсутнічае расліннасць.

У групу найменняў, у аснове якіх ляжыць назва матэрыялу ці выкапняў, што характарызуюць аб'ект, мы аднеслі наступныя мікратапонімы: *Глінаўка* – невялікі лес, які вырас на гліністай глебе (аг. Павяцце, Мёрскі р-н); *Пясчанка* – частка горада, дзе пераважае пясчаная глеба (г. Сянно).

Наступная група – мікратапонімы, што вызначаюць асаблівасці рэльефу аб'екта. Група з'яўляецца нешматлікай і ўключае наступныя найменні: *Гараўцы* – частка вёскі, якая носіць такую назву з-за гарыстага рэльефу (в. Янкавічы, Расонскі р-н); *Гарбатка* – няроўная мясцовасць з раўкамі (в. Лапатнікі, Сенненскі р-н); *Купкі* – поле, гарыстая мясцовасць паміж дзвюма вёскамі (в. Мядзведзі, Гарадоцкі р-н).

Чацвёртая група – мікратапонімы, узнікненне якіх абумоўлена расліннасцю краю. Многія з такіх онімаў ужываюцца ў форме множнага ліку: *Васількі, Дубы, Кедры, Ліпніцы, Чаромушкі.* Большую частку адзінак гэтай групы ўтвараюць онімы, звязаныя з назвамі дрэў і кустоў: *Ліпніцы* – край лесу, парослы ліпамі (в. Рачнёва, Мёрскі р-н); значна радзей сустракаюцца найменні, абумоўленыя назвамі іншых раслін: *Мшкі* – месца на балоце, дзе бралі мох (в. Пыршчына, Глыбоцкі р-н).

Пяты семантычны пласт мікратапонімаў звязаны з падзеямі, што адбываліся ці адбываюцца на пэўнай тэрыторыі. Разгледзім прыклады: *Аэрадром* – месца, дзе ў часы Вялікай Айчыннай вайны партызаны прымалі самалёты (в. Дражна, Віцебскі р-н); *Партызанская паляна* – паляна, якая знаходзіцца за

пяць кіламетраў ад пасёлка. Пасля вайны там адзначалі свята партызаны. Зараз паляна зарасла дрэвамі, але назву захавала (г. Расоны); *Пяты полк* – раён былога ваеннага гарадка ў канцы вуліцы Цітова. Перад Вялікай Айчыннай вайной там знаходзіўся 5-ы чыгуначны полк, які прымаў удзел у савецка-фінскай вайне (г. Віцебск); *Гарэлае балота* – балота, якое гарэла (аг. Камень, Лепельскі р-н); *Чортаў мост* – мост, назва якога сведчыць пра неаднаразовыя здарэнні на гэтым месцы з людзьмі або жывёламі (аг. Камень, Лепельскі р-н).

Мікратапонімы шостай групы звязаны з размяшчэннем аб'екта ў прасторы і выступаюць у якасці арыенціраў: яны дапамагаюць людзям вызначыць месцазнаходжанне і арыентавацца на мясцовасці: *Жалезка* – поле, па якім да вайны да невялікага цагельнага завода праходзіла чыгунка (в. Смалоўка, Гарадоцкі р-н); *Дуліна* – дарога за чыгуначным пераездам. Найменне ўтворана ад назвы вуліцы Дулінская (в. Старое Сяло, Віцебскі р-н); *Кліны* – раён Клінічных вуліц (г. Віцебск). Онімы могуць адрозніваца ад афіцыйных найменняў афіксамі (жалезная дарога > *Жалезка*) ці ўяўляюць сабой усечаны варыянт назвы (вуліца Клінічная > *Кліны*, вуліца Дулінская > *дарога Дуліна*).

Найменні, якія ўказваюць на пэўную частку населенага пункта, таксама з'яўляюцца распаўсюджанымі. Такія назвы дапамагаюць арыентавацца людзям, найперш тым, якія там не жывуць, зразумець, у якой частцы населенага пункта яны знаходзяцца, асабліва ў гарадах: *Васточная* – усходняя частка горада (г. Орша); *Заходняя* – раён горада ў заходняй частцы (г. Орша). Для абазначэння ж цэнтральнай часткі населенага пункта, як правіла, ужываюцца лексемы з коранем *цэнтр- (Цэнтр, Цэнтар, вуліца Цэнтральная).*

Найменні, якія ўказваюць на аб'ект, што знаходзіцца за іншым аб'ектам, ва ўсіх выпадках уключаюць у свой склад прыстаўку *за-* або прыназоўнік *за: За лініяй* – частка гарадскога пасёлка, што змяшчаецца за лініяй чыгункі (г. Шуміліна); *Задняпроўе* – раён горада на другім беразе Дняпра (г. Дуброўна); *Зарэчча* – частка горада, што размяшчаецца на правым беразе рэчкі Мядзелка (г. Паставы). Некаторыя з такіх мікратапонімаў яшчэ толькі праходзяць стадыю фарміравання (напрыклад, *За лініяй*) [2, с. 91].

Сёмая група мікратапонімаў звязана з нацыянальнасцю людзей, назвамі пасад і сваяцкіх адносін: *Латыгава* – частка вёскі, у якой жыў латыш (в. Нябышына, Докшыцкі р-н); *Мэйраў мост* – мост праз ручай, будаўніцтва якога было ініцыявана мэрам (в. Астраўскія, Віцебскі р-н), *Бабіна Прорва* – назва балота ў лесе (в. Бяскі, Дубровенскі р-н); *Дзедава балота* – тэрыторыя на поўдні вёскі, дзе размешчаны балота і частка лесу (в. Макаранкі, Лёзненскі р-н).

Восьмая група – мікратапонімы, матываваныя агульнымі тапаграфічнымі назвамі. Пры іх утварэнні адбываецца пераасэнсаванне значэння слова: *парк > Парк, сасоннік > Сасоннік, бор > Бор.* Трэба адзначыць, што такі пераход агульных тапаграфічных назваў у мікратапонімы назіраецца толькі ў тых выпадках, калі ў пэўнай мясцовасці існуюць адзінкавыя геаграфічныя аб'екты: адзінкавы геаграфічны аб'ект людзі называюць звычайна агульным наменклатурным тэрмінам, які ў сувязі з частым ужываннем яго ў мове становіцца

ўласным іменем, ці мікратапонімам [2, с. 91–92]. Да такіх мікратапонімаў мы аднеслі наступныя найменні: *Бор* – частка вёскі, якая блізка падыходзіць да лесу і ўпіраецца ў сасновы бор (в. Канстантова, Сенненскі р-н); *Замак* – частка вёскі, дзе знаходзіўся панскі маёнтак (в. Асінавік, Докшыцкі р-н); *Вадаспад* – неафіцыйная назва часткі ракі, дзе размяшчаецца вадаспад (в. Александрына, Мёрскі р-н).

Калі ж два аб'екты маюць аднолькавыя рысы (форма, памер і г. д.), узнікае неабходнасць дэталізаваць іх назвы. У такіх выпадках найменні дапаўняюцца прыметнікамі, лічэбнікамі, канструкцыямі з прыназоўнікамі, якія дапамагаюць адрозніць адзін аб'ект ад іншага [2, с. 92]. Да такіх найменняў мы аднеслі наступныя: *Тры дубы* – назва поля паміж дзвюмя вёскамі. Злева знаходзіцца поле, на якім раслі тры вялікія дубы (в. Слабодка, Браслаўскі р-н); *Трэці лес* – лясны абшар паміж дзвюма вёскамі, які перарываецца двума клінамі палеткаў, дзе раней былі хутары (в. Анеліна, Талачынскі р-н).

Пласт мікратапонімаў, утвораных ад агульных тапанімічных назваў, хоць і невялікі, але дапамагае лепш зразумець геаграфію пэўнай мясцовасці. Такія найменні ўказваюць на аб'екты, якія вылучаюцца ў межах той ці іншай мясцовасці і з'яўляюцца адзінкавымі. Часта да дадзеных найменняў далучаюцца прыметнікі, лічэбнікі і іншыя часціны мовы, каб размежаваць некалькі падобных паміж сабой аб'ектаў, што знаходзяцца на адной тэрыторыі.

Дзявятая група – мікратапонімы, утвораныя ад назваў былых ці існуючых вёсак. Такія найменні ў першую чаргу ўказваюць на гісторыю той ці іншай мясцовасці. Разгледзім прыклады: *Свяда* – частка вёскі. Калісьці было дзве вёскі – вёска Свяда і вёска Слабада, але як толькі пачалося актыўнае будаўніцтва жылых дамоў у вёсцы Слабада, гэтыя дамы далучыліся да вёскі Свяда – і вёскі зліліся. У сувязі з гэтым было прынята рашэнне – быць адной вёсцы з назвай Слабада, але тую частку тэрыторыі, якая была вёскай Свяда, мясцовыя жыхары ўсё роўна завуць *Свядай* (в. Слабада, Лепельскі р-н); *Шантары* – частка аграгарадка, што раней з'яўлялася асобнай вёскай, якая далучылася да аграгарадка ў 1910 г. пасля будаўніцтва чыгункі (аг. Параф'янава, Докшыцкі р-н).

Такія мікратапонімы могуць з'яўляцца назвамі не толькі частак вёсак, але і прыродных аб'ектаў у выглядзе частак лесу, берага ракі, крыніцы і г. д.: *Муравушка* – неафіцыйная назва ракі Галядза, якая паходзіць ад назвы вёскі, па якой працякае (в. Мураўшчына, Сенненскі р-н); *Дарожкаўская крыніца* – крыніца над Дзвіной, якая так называецца таму, што далей пачынаецца вёска Дарожкавічы (г. Дзісна, Мёрскі р-н); *Яблыньшчына* – частка лесу каля вёскі, назва паходзіць ад назвы вёскі (в. Яблынка, Талачынскі р-н).

Існаванне назваў, якія паходзяць ад найменняў неіснуючых вёсак, можна звязаць з тым, што тыя ці іншыя вёскі зніклі з карты адносна нядаўна і застаюцца ў памяці жыхароў вёсак, якія знаходзяцца паблізу. Такія мікратапонімы могуць быць значымымі для даследавання гісторыі рэгіёна, бо ўказваюць на месцы, дзе раней знаходзіліся населеныя пункты, якія былі закінуты

ці знішчаны. Як правіла, мікратапонімы, утвораныя ад назваў ужо неіснуючых вёсак, або поўнасцю супадаюць з назвай былой вёскі *(Шантары, Свяда)*, або далучаюць да сябе пэўныя афіксы і іншыя лексемы *(Яблынка > Яблыньшчына, Дарожкавічы > Дарожкаўская крыніца).*

Дзясятая група – онімы, суадносныя з назвамі збудаванняў. У яе ўваходзяць як назвы, утвораныя ад найменняў існуючых збудаванняў (*Раніца* – раён горада, дзе знаходзіцца вялікі гастраном «Раніца» (г. Орша); *Турбаза* – частка горада, дзе размешчана турыстычная база «Браслаўскія азёры» (г. Браслаў), *Бальнічны гарадок* – неафіцыйная назва 1-га і 2-га мікраараёнаў горада, якія атрымалі такое найменне таму, што менавіта тут змяшчаецца вялікі бальнічны комплекс (г. Наваполацк)), так і назвы, утвораныя ад найменняў збудаванняў, якія раней стаялі на гэтым месцы: *Кароўнікі* – неафіцыйная назва вуліцы Бабушкіна; паходжанне назвы звязана з тым, што раней на тым месцы была жывёлагадоўчая ферма (г. Полацк); *Інкубатар* – раён старой забудовы горада, дзе раней знаходзіўся інкубатар для развядзення куранят (г. Орша).

Зафіксаваны таксама назвы, якія неаднаразова сустракаюцца ў розных населеных пунктах Віцебскай вобласці: *МСО* – назва мясцовасці, утвораная ад назвы «Міжкалгасная будаўнічая арганізацыя» (*рус.* «Межколхозная строительная организация»); *Сельгастэхніка (Сельхозтехника)* – назва мясцовасці, утвораная ад назвы арганізацыі «Сельгастэхніка» (*рус.* «Сельхозтехника»).

Сярод мікратапонімаў аналізуемай групы можна вылучыць найменні, што ўказваюць толькі на збудаванне: *Тэхналожка* – неафіцыйная назва Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта (г. Віцебск); *Новы мост* – неафіцыйная назва Паўднёвага маста цераз раку Заходняя Дзвіна на заходнім абходзе горада, які быў уведзены ў эксплуатацыю ў 2008 г. (г. Віцебск). Большасць жа мікратапонімаў указвае не толькі на само збудаванне, але і на бліжэйшую тэрыторыю каля гэтага збудавання: *Станцыя* – цэнтр аграгарадка, дзе змяшчаецца чыгуначны вакзал (аг. Параф'янава, Докшыцкі р-н); *Гаргаз* – частка горада, дзе знаходзіцца прадпрыемства «Браслаўгаз» (г. Браслаў).

Мікратапонімы, утвораныя ад назваў збудаванняў, перш за ўсё выкарыстоўваюцца для арыентацыі ў межах населенага пункта: людзям не абавязкова запамінаць назвы вуліц, якія прылягаюць да таго ці іншага аб'екта, што спрашчае пошук як гэтага аб'екта, так і пэўнай вуліцы. Асобныя назвы ўтвараюцца менавіта ад рускамоўных варыянтаў назваў арганізацый *(МСО, Сельхозтехника).*

Такім чынам, аналіз неафіцыйных рэгіянальных назваў геаграфічных аб'ектаў выявіў, што мікратапанімія Віцебшчыны з'яўляецца разнастайнай у семантычным плане: узнікненне онімаў звязана з падзеямі, якія адбываліся; людзьмі, што жылі на пэўнай тэрыторыі; адметнасцю раслiннага і жывёльнага свету і інш. Кожны з зафіксаваных і прааналізаваных мікратапонімаў утрымлівае каштоўны для вывучэння матэрыял, бо дапамагае раскрыць аспекты культурнага і гістарычнага жыцця людзей даследаванай мясцовасці, з'яўляецца крыніцай інфармацыі для даследчыкаў у галіне этнаграфіі, сацыялогіі, гісторыі, лінгвагеаграфіі, дыялекталогіі.

### *Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Адамовіч, Я. М. Мікратапанімічныя назвы / Я. М. Адамовіч. – Мінск : Вышэйш. шк., 1971. – 112 с.

2. Беларуская антрапанімія : вучэб. дапам. / Г. М. Мезенка, Г. М. Дзеравяга, В. М. Ляшкевіч, Г. К. Семянькова ; [навук. рэд. Г. М. Мезенка]. – Віцебск : УА «ВДУ імя П. М. Машэрава», 2009. – 254 с. – URL: https://rep.vsu.by/bitstream/123456789/2378/5 (дата звароту: 03.09.2024).


*УДК 811.161.3*

**Скачкова В. А.**

*(Гомельскі філіял Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСА», г. Гомель, Беларусь)*

## ЛЕКСІЧНАЯ РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ МАЛОГА ПАМЕРУ Ў МАЎЛЕННІ БЕЛАРУСАЎ

*В статье исследуется использование некоторых прилагательных лексико-семантического поля 'малы' в белорусских говорах и современном белорусском литературном языке. Делается акцент на языковом богатстве белорусских говоров, отмечается разное видение белорусами окружающего мира. Также внимание сосредоточено на ареале распространения единиц на территории Беларуси, анализируется формообразовательный и словообразовательный потенциал лексем. Рассматриваются синонимические связи диалектных лексем, потенциал возникновения единиц, не имеющих различия в семантике, и единиц, выражающих разную степень проявления того или иного признака, сочетающих указанные градации с оценкой говорящего или различающихся наличием либо отсутствием оценочного момента.*

***Ключевые слова:*** *современный белорусский литературный язык, диалектный язык, лексико-семантическое поле, коннотация, лексико-словообразовательный вариант, синонимия, словообразование, формообразование.*

У далёкія часы чалавек, назіраючы за разнастайнымі рэаліямі жыцця і параўноўваючы іх адно з адным, выдзяляе такія якасці, як многа, шмат – мала, нямнога; больш – менш; высока – нізка; глыбока – мелка і інш. Гэтыя параметрычныя ўласцівасці з'яўляюцца вынікам успрыняцця акаляючага свету з дапамогай зроку, вызначаюцца адносна пэўнай 'норме', 'эталона' ці сярэдняй ва ўсведамленні большасці людзей меры як пункта адліку для фарміравання характаралагічных значэнняў. Яны прадстаўляюць і характарызуюць свет у разнастайных вымярэннях – доўгі – кароткі, шырокі – вузкі, вялікі – малы і г. д., з'яўляюцца характарыстыкамі базавага ўзроўню, належаць да агульнаўжывальнай лексікі беларускай мовы і выступаюць асноўным сродкам дакладнага і выразнага маўлення.

Пры выражэнні паняцця памеру прыметнікі займаюць дамінуючае становішча ва ўсіх сферах бытавога, гаспадарчага, грамадска-палітычнага і культурнага жыцця грамадства. Гэтым і тлумачыцца, што самыя яскравыя, глы-